# АБ АЎТАРАХ

*Юры Александрэнкаў* — сацыёляг, кандыдат сацыялягічных навук. Тэма абароненай у 2006 г. дысэртацыі — “Сыстэма сацыялёгіі Ф.Знанецкага: тэарэтычная рэканструкцыя”.

*Натальля Васілевіч* — палітоляг, магістар гуманітарных навук, асьпірантка катадры паліталёгіі БДУ, рэдактар сайту “Беларускі партал” “Царква” (churchby.info).

*Андрэй Казакевіч* — палітоляг, галоўны рэдактар часопісу «Палітычная сфера». Кіраўнік праграмы “Паліталёгія. Эўрапейскія дасьледаваньні” Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту з сакавіка 2006 г. Падрыхтаваў да абароны дысэртацыю “Тэарэтычныя аспэкты палітычнага аналізу судовай улады Беларусі”.

*Андрэй Камышэвіч* — палітоляг, жыве й працуе ў Заслаўі.

*Мікола Кацук* — сацыёляг, супрацоўнік Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі.

*Дзяніс Мельянцоў* — палітоляг, магістар паліталёгіі і міжнародных адносінаў, асьпірант катадры міжнародных адносінаў БДУ.

*Андрэй Ляховіч* — палітоляг, прэзыдэнт Цэнтра палітычнай адукацыі.

*Аляксандар Сарна* — філёзаф, кандыдат філязофскіх навук, выкладчык БДУ.

*Віталь Сіліцкі* — палітоляг. Магістар Цэнтральнаэўрапейскага ўнівэрсытэту ў Будапэшце, доктар PhD у паліталёгіі ўнівэрсытэту Радгерса (Rutgers University). У 1998-2003 гг. — дацэнт Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту ў Менску. Быў звольнены за публічную крытыку рэжыму Лукашэнкі. У 2006 г. быў запрошаным дасьледнікам Цэнтру вывучэньня дэмакратыі, разьвіцьця і праўнай дзяржавы (Стэнфардзкі ўнівэрсытэт, ЗША). Сурэдактар “Гістарычнага слоўніка Беларусі” (“Historical Dictionary of Belarus”, Scarecrow Press), выхад якога заплянаваны на пачатак 2007 году. Падрыхтаваў да друку кнігу “The Long Road from Tyranny: Post-Communist Authoritarianism and Struggle for Democracy in Serbia and Belarus”.

*Юры Чавусаў* — палітоляг, праваабаронца ў галіне свабоды асацыяцыяў і правоў няўрадавых арганізацыяў, сябра Сойму Партыі БНФ.